Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ +ТВ Рэклама

21 красавіка 2012 года
Субота

№31 (10144)

**У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ**

## ПАЛЯВАННЕ – ПА ЎСІХ ПРАВІЛАХ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным скарэкціраваць правілы палявання ў Беларусі. Такую думку кіраўнік дзяржавы выказаў 19 красавіка на нарадзе па пытаннях развіцця сферы палявання і рыбалоўства.**

«Калісьці ў нас быў непарадак з Правіламі дарожнага руху. Міліцыя ўносіла кожны год змяненні. Як толькі ўказам Прэзідэнта былі зацверджаны гэтыя Правілы, дык з таго часу толькі адзін раз, напэўна, уносіліся змяненні. І разбой спыніўся! Можа, і тут пайсці гэтым шляхам? Выпрацаваць правілы, якія будуць мець фактычна сілу закона, і зацвердзіць?» – лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Давайце прымем новую рэдакцыю гэтых правіл – цвёрдых, адназначных і зразумелых, – падкрэсліў Прэзідэнт. – Мы павінны выйсці на адзіныя правілы, на папраўкі ў заканадаўчыя акты вядзення палявання, рыбалоўнай гаспадаркі».

## НАВАСЕЛЛІ БУДУЦЬ СВЯТКАВАЦЦА ЧАСЦЕЙ

**Перыяд забеспячэння беларусаў жыллём плануецца скараціць да 3-5 гадоў з моманту пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Аб гэтым гаворыцца ў праекце Канцэпцыі дзяржаўнай жыллёвай палітыкі Беларусі на 2012-2015 гады, які да 15 мая вынесены на грамадскае абмеркаванне.**

Перыяд забеспячэння жыллём з моманту пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў плануецца скараціць да 3 гадоў для шматдзетных сем'яў, да 5 гадоў (у Мінску – да 7 гадоў) для ваеннаслужачых, сем'яў, якія не маюць уласнага жылля, пражываюць у непрыдатных для пражывання дамах, грамадзян, якія пражываюць не менш як дзесяць гадоў у інтэрнатах, у жылых памяшканнях дзяржаўнага жыллёвага фонду па дагаворах паднайму жылога памяшкання, у жылых памяшканнях прыватнага жыллёвага фонду па дагаворах найму жылога памяшкання, якія не маюць ва ўласнасці жылых памяшканняў, і для іншых сацыяльна прыярытэтных катэгорый грамадзян.

Праектам дакумента прадугледжваецца, што да 2020 года тэрмін знаходжання на чарзе шматдзетных сем'яў і найменш сацыяльна абароненых ільготных катэгорый грамадзян не будзе перавышаць двух гадоў.

У планах на 2012-2015 гады – пабудаваць у Беларусі 28,7 млн кв.м жылля, што складзе каля 300 тыс. жылых адзінак. Такім чынам, узровень забяспечанасці насельніцтва краіны жыллём у разліку на аднаго жыхара вырасце з 25 кв.м у 2011 годзе да 27-28 кв.м у 2015 годзе.

**Паводле БелТА**

**СОТРУДНИЧЕСТВО**

# Добруш и Йези – города-побратимы




**Говорить об Италии, ее особенностях, возможностях, а также о важности двухстороннего сотрудничества между Беларусью и Италией можно бесконечно долго. Будучи этнически мононациональным, это государство представляет собой ярчайшее соцветие самодостаточных, колоритных, непохожих друг на друга регионов. Каждая итальянская область – Тоскана, Лацио, Лигурия, Сардиния или другая – как отдельный мир, манящий и завораживающий своей историей и традициями. И каждый из этих итальянских «миров» сулит хорошие перспективы взаимодействия для тех, кто этого действительно желает.**

Что особенно приятно: Беларусь в Италии хорошо знают. Наверное, нет другого государства на Западе, которое, находясь, по сути, в ином геополитическом и региональном измерении и не имея общих границ, настолько тепло относилось бы к нашей стране.

Разумеется, во многом это результат давнего теснейшего гуманитарного сотрудничества. Все помнят, как после катастрофы, случившейся на Чернобыльской АЭС, простые итальянцы предложили белорусам свою помощь. И вот уже несколько десятилетий здесь абсолютно бескорыстно принимают в своих семьях на оздоровление наших детей. За это время, согласно статистическим данным, около 500 тысяч маленьких белорусов отдохнули в Италии.

**(Окончание – на 2 с.)**

**На фото: подписание двухстороннего соглашения о техническом, экономическом и культурном сотрудничестве между Добрушским районным исполнительным комитетом и Итальянской муниципальной администрацией г. Йези**

**КОРАТКА**

**Графік работы ўстаноў аховы** здароўя ў сувязі з пераносам рабочага дня ў красавіку зменены. Амбулаторна-паліклінічныя ўстановы 21 і 23 красавіка будуць працаваць па графіку суботняга дня. Па графіку выхаднога – 22 і 29 красавіка. На 24 красавіка прадугледжаны графік работы святочнага дня.

**Інфляцыя** ў Беларусі ў 2012 годзе захаваецца ў сярэднім на ўзроўні 1,5 працэнта ў месяц, заявіў міністр эканомікі Мікалай Снапкоў.

**Рашэнне Антыкрызіснага фонда** ЕўрАзЭС па выдзяленні Беларусі чарговага транша крэдыту можа быць прынята ў маі.

***З 22 па 26 красавіка*** *пункты спрошчанага пропуску праз Дзяржаўную граніцу Рэспублікі Беларусь "Андрэеўка" і "Паддабранка", што размешчаны на тэрыторыі нашага раёна, будуць працаваць* ***з 7 да 20 гадзін.***

*Аб гэтым паведамілі ў Гомельскай пагранічнай групе.*

ISSN 2073-1000

**ПОГОДА**

Долгота дня 14.22
Луна
21, 22, 23 апреля – в Тельце,
24, 25 – в Близнецах

Новолуние

**22 апреля**
НОЧЬЮ +11…+13
ДНЕМ +15…+17
Переменная облачность.
Умеренный дождь.
Ветер южный 4-6 м/с.

**23 апреля**
НОЧЬЮ +10…+12
ДНЕМ +17…+19
Переменная облачность.
Возможен дождь.
Ветер юго-западный 4-6 м/с.

